# **Выхаваўчае значэнне народнай гульні**

*Матусевіч Таццяна Пятроўна,*
*намеснік дырэктара па вучэбна-метадычнай рабоце,*
*настаўніца беларускай мовы і літаратуры*

“У гульнях развіваецца душэўнае жыццё дзіцяці, фарміруецца асоба, праяўляюцца пакрыху яго таленты. Дзіцячая гульня – гэта праяўленне творчага душэўнага жыцця, укладзенага ў чалавека Богам. Дзеці, якіх пазбавілі гульні, спыняюцца ў сваім духоўным развіцці. Гэта не новая педагагічная тэорыя. Добрыя выхавальнікі заўсёды так адчувалі і так думалі. Памятаю, як мая маці расказвала мне пра сваю, любімую ёю, гувернантку, якая гаварыла больш за сто гадоў таму назад: “Галоўны абавязак дзяцей – гэта гуляць, умець гуляць…” [2.136], – так пісала пра значэнне дзіцячай гульні прафесар Свята-Уладзімірскай Духоўнай семінарыі С.С. Куламзіна.

Мне б хацелася звярнуць увагу меневіта на разнастайнасць і значэнне ў сучасным жыцці народнай гульні, пра якую цяпер забываюць усе: бацькі, выхавацелі, настаўнікі і, безумоўна, дзеці. Раней казалі ў народзе: “Гуляй, дзяціна: твая часіна”. І, сапраўды, малыя ў вольным баўленні часу ніколі не абыходзіліся без гульні. Ракава Л.В. у кнізе “Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы” адзначае: “Гульні былі амаль адзіным іх (дзяцей) заняткам у вольны час” [4.69].

Вучні нашай гімназіі, займаючыся зборам фальклорнага рэгіянальнага матэрыялу, задалі пытанне 85–гадовай жыхарцы вёскі Ілішчавічы Вілейскага раёна Вазняк Веры Паўлаўне: “Якія гульні вы ладзілі ў свой вольны час у дзяцінстве і юнацтве?” Падлеткаў здзівіў і ўразіў наступны адказ: “Мала я гуляла, бо патрэбна было працаваць змалку: свінні пасвіць, хату глядзець, меншыя браты, сёстры былі на мне… Мала прыпомню гульняў – старая ўжо памяць” [1]. Пры гэтым жанчына з лёгкасцю назвала і падрабязна апісала амаль два дзясяткі гульняў свайго дзяцінства і маладосці.

Калі я з вучнямі аналізавала вынікі фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі на класнай гадзіне, то засяродзіла ўвагу на гутарцы з Верай Паўлаўнай пра гульнёвыя традыцыі. Падлеткі (вучні 8 класа) паспрабавалі ўспомніць гульні свайго дзяцінства. Імі аказаліся: “Зорныя войны”, “Мафія”, “Піянербол”, камп’ютарныя гульні, 1–2 традыцыйныя, засвоеныя ў дзіцячым садку ці на двары… Ніхто з вучняў класа не назваў гульні “ў домік”, “дочкі–маці” і падобныя, на якія Вера Паўлаўна і бацькі падлеткаў указвалі, як на самыя працяглыя (па некалькі тыдняў і нават месяцаў маглі доўжыцца) і цікавыя. Вучні самі прыйшлі да высновы, што тэлевізар і камп’ютар замянілі ім гульнёвыя стасункі не толькі з аднагодкамі, але і з навакольным светам. З гэтага вынікае, што гульнёвая дзейнасць, заснаваная на народных, выпрацаваных тысячагоддзямі традыцыях, знікае вельмі хутка і замяняецца непаўнавартаснымі камп’ютарнымі гульнямі ці сядзеннем у сацыяльных сетках. А ў народзе гавораць: “Хто паношаную рэч без патрэбы выкідае, у таго новая рэдка бывае”. Іншасказальны сэнс гэтай прыказкі можна перанесці і на традыцыйную беларускую гульню. Часта здараецца так (асабліва ў сучаснай сям’і, у адукацыйных і выхаваўчых установах), што беларуская народная традыцыя баўлення часу дзецьмі амаль поўнасцю замяняецца няродным, замежным, прыдуманым. Сваё ўсё ж адкідаць не варта, бо беларуская народная гульня мае вялікае адукацыйнае, развіццёвае і выхаваўчае значэнне.

Гульня з’яўляецца вядучым відам дзейнасці ў дашкольным і нават малодшым школьным узросце. Народная гульня можа дапамагчы настаўніку пачатковых класаў наладзіць кантакт з вучнямі, падлеткам – будаваць узаемаадносіны з аднагодкамі, у дарослых яна можа быць сродкам цікавага адпачынку, сродкам устанаўлення кантактаў паміж дзецьмі і бацькамі. Таму народная гульня мае права на ўвагу як да аднаго з дзейсных сродкаў развіцця і выхавання.

Паколькі натуральныя ўмовы пераемнасці гульнёвых традыцый амаль перарваныя (раней старэйшыя дзеці гулялі, а меншыя назіралі і далучаліся да

гульні паступова, а ў наш час рознаўзроставыя згуртаванні дзяцей і падлеткаў рэдкія), то, напэўна, толькі дзіцячы сад, школа і іншыя выхаваўчыя ўстановы могуць дапамагчы захаваць беларускі народны гульнёвы матэрыял.

Адвечны канфлікт бацькоў і дзяцей, няўменне наладжваць кантакты паміж пакаленнямі турбуюць многіх дарослых. У школе магчыма ўстанавіць стасункі паміж дзядамі і ўнукамі, бацькамі і дзецьмі з дапамогай народнай гульні. І мы зразумелі гэта на асабістай практыцы. Народную гульню або яе асобныя элементы мы шырока выкарыстоўваем пры правядзенні ўрокаў, класных гадзін, паходаў, паездак і іншых пазакласных мерапрыемстваў, бацькоўскіх сходаў.

Сем гадоў запар я працавала класным кіраўніком у класе фальклорна–тэатральнай накіраванасці. Збор мясцовага матэрыялу па традыцыйнай культуры быў проста неабходны гэтаму класу для працы на ўроках тэатра, танца, спеваў, дляладжання фальклорных святаў.

Класаў этнашколы ў гімназіі больш няма, але мы з вучнямі працягваем збіраць мясцовыя фальклорныя матэрыялы і выкарыстоўваць іх у адукацыйным працэсе. Пусціць дзяцей “у народ”,  даць заданне запісаць забаву, песню, ці легенду можна. Калі–нікалі дзеці гэтае заданне могуць выканаць. Але многія сучасныя школьнікі–падлеткі амаль не маюць вопыту ўзаемін са сваімі бабулямі і дзядулямі ў пераемнасці народных духоўных каштоўнасцяў і традыцый, таму часта “правальваюць” заданні. Можна пачаць з запісу гульняў сваёй сям’і. Школьніку даволі проста дома спытаць у дарослага пра тое, як яны (маці ці бацька, бабуля ці дзядуля) гулялі ў дзяцінстве. Сталыя людзі звычайна з радасцю дзеляцца сваімі ўспамінамі, а ў падлеткаў паступова знікае абыякавае стаўленне да свету дарослых, прабуджаецца цікавасць да беларускіх традыцый, выпрацоўваецца жаданне цікавіцца перажываннямі блізкага чалавека, уменне слухаць і заўважаць. Да прыкладу, дзякуючы заданню па зборы традыцыйнага гульнёвага матэрыялу сваёй сям’і, вучні класа, дзе я з’яўлялася класным кіраўніком, даведаліся пра колішняе бытаванне на Вілейшчыне наступных народных гульняў:

“Цыбулька”, “Пікар”, “Птушкі і кот”, “У чыжыка”, “Просу сеяць”, “Лапта”, “Гусі” і іншыя. Падлеткі шчыра здзіўляліся таму, што гульні тыпу “Хованкі”, “Жмуркі”, “Халі–хало” і іншыя бытавалі ў гады дзяцінства іх (“мілых, але такіх несучасных”!) бабуль і дзядуль і захаваліся да цяперашняга часу. А самым нечаканым для дзяцей было тое, што ў сваіх кампаніях яны могуць выкарыстаць юначыя гульні сваіх “продкаў”: “Авес парыць”, “У суседа”, “Фанты” і іншыя. Гэта азначае, што кантакт паміж пакаленнямі можа існаваць, што выхаванню павагі да людзей сталага пакалення садзейнічае і народная гульня (прычым працэс выхавання праз збор і далейшае выкарыстанне народных гульняў ідзе натуральна, незаўважна, без прымусу).

“Традыцыйныя дзіцячыя гульні з уласцівымі ім парадкам і правіламі дапамагалі асвойваць культуру свайго народа” [4.6], – заўважае Л.В. Ракава ў кнізе “Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы”. А ў кнізе “Народная педагогіка беларусаў” падкрэсліваецца вялікае значэнне для духоўнага, разумовага і фізічнага развіцця асобы дзіцяці знаёмства з гульнямі свайго народа, якія “ўводзяць не толькі ў стыхію народнага мастацкага жыцця, але і выхоўваюць погляд на свет, этычныя і маральныя правілы, выпрацаваныя нацыяй і ўсвядомленыя ёю як неабходнасць пры фарміраванні нацыянальнага характару” [3.144]. З гэтымі выказваннямі цяжка не пагадзіцца. Праз народную гульню адбываецца сувязь пакаленняў, перадача жыццёвага вопыту, культурных традыцый, ідзе гендэрнае выхаванне і падрыхтоўка да дарослага жыцця, развіваецца цікавасць да царкоўнай традыцыі, выхоўваецца павага да набыткаў нацыянальнай культуры і пачуццё патрыятызму.

На мой погляд, традыцыйны гульнёвы матэрыял беларусаў, які надзелены выдатнымі развіццёвымі магчымасцямі, мала выкарыстоўваецца ў сучасных выхаваўчых і адукацыйных установах, недаацэньваецца педагогамі яго значэнне для станаўлення асобы выхаванцаў. Мне ж здаецца, што традыцыйную гульню можна прымяняць на любых уроках і ў

пазакласнай працы. Прывяду некалькі прыкладаў выкарыстання гульнёвага матэрыялу ў школе ў пацверджанне яго шырокіх выхаваўчых магчымасцей. Настаўнікі на ўроках для фізічнай і псіхалагічнай разрадкі вучняў (для фізкультурных хвілінак) выкарыстоўваюць шмат аўтарскага (часта нядрэннага) матэрыялу для разняволяння цягліц рук. Гэта добра. Але многія забываюць ці не ведаюць, што побач з аўтарскім можна выкарыстаць і народнае. Вядомая гульня–забаўлянка “Сарока–варона” дапамагла б і цягліцы разняволіць, і садзейнічала б выхаванню павагі да працы, і пра народныя традыцыі напомніла б; і, магчыма, дзіця, якое ў будучым стане дарослым, песцячы ўжо сваіх нашчадкаў, успомніла б гэтую забаўлянку, не дало б ёй знікнуць бясследна.

Адным з элементаў урока фізкультуры з’яўляецца рухомая гульня. Заўважыла, што даволі часта (нават у старэйшых класах) выкарыстоўваюцца настаўнікамі беларускія народныя гульні, але без аб’яў пра месца іх (гульняў) бытавання, без тлумачэння традыцый выкарыстання. Можна дапусціць наступнае: калі б вучань ведаў, што ён цікава і з карысцю для асобы гуляе на ўроку менавіта так, як калісьці гулялі яго продкі, то гэтая паінфармаванасць школьніка садзейнічала б фарміраванню любові да малой радзімы, цікавасці да народных традыцый свайго краю.

Слоўны матэрыял каляндарных, сямейна-абрадавых і не звязаных з календаром і абрадамі гульняў можа выкарыстоўвацца на ўроках роднай мовы і літаратуры. Для вучняў гэта і цікава, і захапляльна, і пазнавальна. Напрыклад, на ўроку беларускай мовы пры вывучэнні тэмы “Часы дзеяслова” можна адпачыць і адначасова разгледзець слоўны матэрыял гульні “Просу сеялі” (запісаны вучнямі ад Графчык М.Р.Ю, 1921 года нараджэння, жыхаркі вёскі Бабровічы Валожынскага раёна Мінскай вобласці).

Правільна выкарыстаная традыцыйная мясцовая народная гульня і на класных гадзінах, і ў час правядзення гасцёўняў,ладжання святаў класа і на іншых мерапрыемствах будзе садзейнічаць збліжэнню класнага калектыва, развіццю пачуцця таварыскасці і шчырасці ва ўзаемінах. У нашай гімназіі

ёсць вопыт і метадычныя напрацоўкі выкарыстання гульняў свайго рэгіёна ў школьным адукацыйна–выхаваўчым працэсе.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**


1. Асабісты архіў Матусевіч Т.П. Запісы этнаграфічных экспедыцый.
2. Куломзина, С.С. Наша церковь и наши дети / С.С. Куломзина. – Москва: Мартис, 1994. – 158 с.
3. Народная педагогіка беларусаў / А.А. Грымаць [і інш.]; пад агульнай рэд. А.А. Грымаць. – Мінск: Выд. У.М.Скакун, 1999. – 256 с.
4. Ракава, Л.В. Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы / Л.В. Ракава. – Минск: Ураджай, 2000. – 111 с.